# А ў Чачэрску была асамблея

У сацыяльна-радыяцыйным пашпарце гэтага раёна, які складзены Інстытутам радыялогіі, значыцца, што чарнобыльская навала, якая і дагэтуль хавае ў сабе небяспеку, вымусіла адсяліць з 32 населеных пунктаў Чачэршчыны па стане на пачатак 2007 года 8986 чалавек. Чатыры вёскі наогул былі пахаваныя ў зямлю, бо яны, як кажуць, выпраменьвалі радыяцыю. Толькі за адзін 1990 год у іншыя мясціны рэспублікі пераехалі 2646 сем’яў. Непапраўныя страты панесла народная гаспадарка. На вышэйназваную дату з севазвароту было выведзена 12 374 гектары зямель, некалькі калгасаў наогул перасталі існаваць. Ды інакш і не магло быць, таму што многія плошчы "пад завязку" аказаліся загружанымі радыенуклідамі.

Не будзем пералічваць усе беды, якімі "мірны" атам захліснуў раён, але адзначым, што распрацаваная дзяржаўная праграма па мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай трагедыі і Закон "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС" паступова рабілі сваю справу: сітуацыя паляпшалася. І паляпшаецца цяпер. Будавалася жыллё, пракладваліся дарогі, водаправоды, праводзіўся газ, у медыцынскія ўстановы набывалася новае абсталяванне і г.д. Шэраг населеных пунктаў перайшоў з зоны з правам на адсяленне ў зону пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем, а іншыя вёскі — з зоны наступнага адсялення ў зону з правам на адсяленне. Працуюць школы, клубы, развіваецца мастацтва, культура, спорт. Раён, адным словам, жыве, глядзіць у будучыню, што зусім не азначае, што тут у пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы ўжо ўсё зроблена як мясцовымі органамі ўлады, так і з дапамогай вышэйшых уладаў.

Днямі ў райцэнтры адбылася асамблея пад назвай "Дыялог кіраўніцтва Гомельскай вобласці з актывам і насельніцтвам Чачэрскага раёна" і свята беларускай музыкі "Чачэрскія сустрэчы-2009". Сёлета райцэнтру спаўняецца 850 гадоў, і на парадку дня паўстала побач з іншымі пытанне: з чым раён ідзе да гэтай падзеі, якая дапамога патрэбна.

Даўшы "запеўку" дыялогу, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Валерый Сяліцкі нагадаў, што сёння ва ўмовах фінансава-эканамічнага крызісу, які не абышоў і нашу рэспубліку, часы няпростыя, таму ажыццявіць раней намечанае будзе нялёгка, але будзе зроблена ўсё, што абласнымі службамі па сілах на гэты момант, калі ў "запрэжцы" з імі будзе і раён, калі апошні не будзе ў ролі назіральніка. Ды такога быць не можа, у тон яму адказаў старшыня райвыканкама Іван Ком.

Слушнымі былі пытанні, якія задавалі прадстаўнікі працоўных калектываў і грамадскасці раёна. Напрыклад, ці нельга выдзеліць грошы для асфальтавання цэнтральных вуліц горада і пад’ездаў да школ у райцэнтры ў суме 12 мільярдаў рублёў, бо асфальта-бетоннае пакрыццё на іх прыйшло ў непрыдатнасць? Ці будзе пракладзены водаправод па вуліцы Акцябрскай, ці знойдуцца грошы для рэканструкцыі гарадскога парку? Высветлілася, што на рэканструкцыю парку прадугледжана выдзеліць, згодна з адпаведным рашэннем аблвыканкама, паўтара мільярда рублёў. На добраўпарадкаванне вуліц і тэрыторый у два апошнія гады раён выкарыстаў 885 мільёнаў рублёў. Сёлета, згодна з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта краіны, праектам пастановы Урада мяркуецца павелічэнне лімітаў фінансавання Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС за кошт сродкаў, якія выслабаняюцца ў сувязі з прыняццем Закона "Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян".

Будзе разгледжана і наступная праблема. На тэрыторыі раёна знаходзіцца комплекс па пахаванні таксічных прамысловых адходаў вобласці, а плацяжы ў бюджэт, у тым ліку і экалагічны падатак, накіроўваюцца ў бюджэт Гомеля. Сума немалая — 136,2 мільёна рублёў летась. Лішнімі яны ў раёне не будуць. З прычыны таго, што фактычная дзейнасць комплексу ажыццяўляецца на тэрыторыі Чачэршчыны, ён павінен змяніць юрыдычны адрас з усімі наступнымі вынікамі.

На асамблеі была дасягнута дамоўленасць на будаўніцтва ў перспектыве новай малочнатаварнай фермы на 700 галоў буйной рагатай жывёлы ў КСУП "Бацвінава" і выдаткаванне сёлета 704 мільёнаў рублёў адкрытаму акцыянернаму таварыству "Чачэрск-

агратэхсэрвіс" для ўводу ў вытворчы працэс рамонтнай майстэрні і станцыі тэхнічнага абслугоўвання трактароў.

Далей. Інфраструктура горада Чачэрска склалася так, што два яго прамысловыя прадпрыемствы — вінзавод і РДПТУП "Надзея" займаюць 93 працэнты ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці. Першы, які надзейна і з прыбыткамі працаваў у мінулыя гады, апошнім часам па розных прычынах здаў свае пазіцыі і для далейшай дынамічнай работы тут неабходна ствараць новыя вытворчасці канцэнтраваных сокаў, глыбокай замарозкі пладоў і ягад. Ці магчыма дзяржаўная фінансавая падтрымка гэтага, пыталіся работнікі вінзавода.

Адказ быў такі. У камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама разглядаецца пытанне аб уключэнні Чачэрскага вінзавода ў праграму "Пладаводства" з выдзяленнем матэрыяльных рэсурсаў на набыццё саджанцаў. Да ста гектараў садоў, якія перададзены заводу сельгаспрадпрыемствамі раёна, і 20 гектараў кустоўя прадпрыемству выдзелена 40 гектараў ворыва пад пасадку ягаднікаў, што, вядома, добра. Аднак бізнэс-планы па гэтых напрамках развіцця вытворчасці не распрацаваны, і ў фінансавае ўпраўленне аблвыканкама ніхто не звяртаўся адносна аказання прадпрыемству дзяржаўнай падтрымкі. Так што пытанне патрабуе больш дэталёвага вывучэння.

Дадатковыя прапрацоўкі патрабуюцца і пры вырашэнні пытання будаўніцтва тыпавых рамонтных майстэрняў на 25 умоўных працоўных месцаў у

КСУПах "Вазнясенск" і "Нісімкавічы".

На гэтым пытанні фінансавай дапамогі раёну з мэтай яго далейшага развіцця не закончыліся. Бо паступіла прапанова аказаць яе для арганізацыі новых прамысловых вытворчасцяў, выкарыстоўваючы мясцовую сыравіну. Меліся на ўвазе залежы крэйды ў наваколлях вёсак Залессе, Валосавічы і Нісімкавічы.

Сапраўды, адзначалася на асамблеі, радовішча крэйды ў Нісімкавічах ўключана ў спіс разведаных нераспрацаваных залежаў цвёрдых карысных выкапняў вобласці, але для падрыхтоўкі радовішча да прамысловага асваення неабходна яшчэ выканаць дадатковыя геолага-разведвальныя работы, і да 2010 года яны не прадугледжаны.

Што ж датычыцца пытанняў фінансавання раёна за кошт сродкаў рэспубліканскага фонду аховы прыроды, дык у 2007—2008 гадах было накіравана іх сюды ў суме 1300 мільёнаў рублёў, што ў два разы перавышае суму, якая паступіла ў той фонд з раёна. Сёлета ж у выглядзе субвенцый аблвыканкама раён атрымае фінансавыя сродкі на ліквідацыю крыніц забруджвання паверхневых і грунтовых водаў сцёкамі жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў, на прыродаахоўныя мерапрыемствы на малочнатаварных фермах, якія будуюцца, і на развіццё дзейнай і стварэнне дадатковай інфраструктуры аграгарадкоў, знос непрыдатных сельскагаспадарчых збудаванняў, рэкультывацыю зямель.

***Уладзімір ПЕРНІКАЎ.***

**Источник:** Звязда.-2009.-25 крас.-С.4.